# БУКВАР: гісторыя стварэння

*Буквар як першая кніга, праз якую чалавек спасцігае свет, варты навуковай увагі. У прапанаваным артыкуле аўтары робяць гістарычны агляд стварэння буквара ад старажытнасці да нашых дзён.*







**М. Г. ЯЛЕНСКІ,**
доктар педагагічных навук,
прафесар

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт

У артыкуле разглядаецца гісторыя стварэння буквароў на тэрыторыі Беларусі. Раскрываецца іх роля не толькі ў навучанні грамаце (першапачатковаму чытанню і пісьму), але і ў духоўным, асветніцкім аспектах. Дэталёва характарызуюцца найбольш значныя буквары, распрацаваныя на аснове розных метадаў навучання.

**Ключавыя словы:** буквар, лемантар, навучанне чытанню, літаразлучальны метад навучання грамаце, гукавы метад навучання грамаце, метад цэлых слоў, гукавы аналітыка-сінтэтычны метад навучання грамаце.

The article describes the history of primers creation on the territory of Belarus and reveals the role of them not only in the context of literacy training (primary reading and writing skills) but in spiritual and educational contexts as well. It gives detailed characteristics of the most important primers based on different teaching methods.

**Keywords:** ABC book, learning to read, bukvoslagatelny method of literacy, literacy sound method, the method of whole words, sound analytical and synthetic methods of teaching reading and writing.

Па ініцыятыве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сёлета грамадскасць нашай краіны адзначае 400-годдзе буквара. Але на самай справе гісторыя буквара больш даўняя.

Як жа авалодвалі граматай, калі не было буквароў? Да з'яўлення першых буквароў для навучання грамаце выкарыстоўваліся спецыяльныя дошчачкі, берасцяныя сшыткі з алфавітам. У Брэсце знойдзена своеасаблівае сведчанне самых першых нашых буквароў — самшытавы грэбень з алфавітам (XII—XIII стст.).

Пазней авалоданню граматай садзейнічалі кнігі рэлігійнага характару. Так, "Біблія" Францыска Скарыны мела не толькі духоўнае, але і вялікае асветніцкае значэнне. У Сярэднявеччы Псалтыр быў асноўнай кнігай, па якой вучыліся грамаце. Скарына высока цаніў Псалтыр як крыніцу ведаў, добрых нораваў, эстэтычнага задавальнення. Ён першы паспрабаваў наблізіць тэкст рэлігійнай кнігі да народнай мовы, выдаўшы Псалтыр на царкоўна-славянскай мове з тлумачэннямі незразумелых слоў на палях (Прага, 1517 г.).

Францыск Скарына для лепшага запамінання ілюстраваў загалоўныя літары тэкстаў малюнкамі жывёл, раслін. Гэта асаблівасць старажытных кніг выкарыстоўваецца і зараз пры навучанні грамаце.

Першую азбуку выпусціў у Львове Іван Фёдараў у 1574 г. (каля 1580 г. яна была перавыдадзена ў Астрогу). Затым у Вільні выйшлі буквар "Начало учениа детем" (друкарня братоў Мамонічаў, 1593 г.) і азбука Зізаніяў "Наука ку читаню и розуменю писма словенского" (Брацкая друкарня, 1596 г.). У 1618 г. у друкарні Святадухаўскага віленскага брацтва надрукаваны еўеўскі буквар. У 1631 г. буквар быў выдадзены Спірыдонам Собалем у Куцеінскай друкарні, у 1636 г. у Магілёўскай брацкай друкарні ў Буйнічах ім жа выдадзены "Буквар языка славенска". Пазней з'явіўся буквар Сімяона Полацкага (Масква, 1679 г.), па якім вучыліся царскія дзеці.

Першыя буквары адыгралі вялікую ролю ў распаўсюджанні асветы ў Расіі, Беларусі, Украіне і Літве. У названых букварах змяшчаліся тэксты свецкага і рэлігійнага характару. Навучанне чытанню грунтавалася на літаразлучальным метадзе. Яно мела дагматычны характар, трымалася на механічным запамінанні матэрыялу.

Вучоныя сцвярджаюць, што з канца XVI да сярэдзіны XVII ст. у Беларусі выйшла 16 букварoў [1].

У 1835 г. у Вільні была надрукавана па-беларуску (з загалоўкам на польскай мове) чытанка "Кароткі збор хрысціянскай навукі для сялян рымска-каталіцкага веравызнання, якія гавораць на польска-рускай мове", а ў 1862 г. у сувязі з уздымам нацыянальна-вызваленчага руху выйшаў у Варшаве "Лемантар для добрых дзетак католікаў". Ёсць меркаванне, што да выдання гэтага буквара меў дачыненне вядомы ўдзельнік паўстання ў Беларусі і Літве Аляксандр Аскерка.

У 1906 г. у Пецярбургу выдавецкай суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца" быў ананімна надрукаваны "Беларускі лемантар, або Першая навука чытання". Мяркуюць, што непасрэдны ўдзел у яго падрыхтоўцы прымаў Карусь Каганец. Канстанцін Міцкевіч (Якуб Колас) у "Методыцы роднае мовы" адзначае, што аўтарам "Беларускага лемантара" з'яўляецца Алаіза Пашкевіч (Цётка) [2, с. 389]. Лемантар быў надрукаваны лацінкай і кірыліцай, распрацаваны на аснове сінтэтычнага літараскладальнага метаду. Пачынаўся лемантар з прадмовы, у якой аўтар даваў парады, як трэба вучыць чытаць.

У 1906 г. у Пецярбургу выйшла "Першае чытанне для дзетак-беларусаў" А. Пашкевіч. У пачатку кнігі для тых, хто не вучыўся чытаць па лемантары, коратка паведамлялася пра асобныя гукі, прыводзілася іх літарнае абазначэнне. Далей прапаноўваліся невялікія звязныя тэксты для чытання (прыказкі, прымаўкі, загадкі, прыпеўкі, казкі, апавяданні, вершы). Далітарны і букварны этапы навучання грамаце ў кнізе не былі прадстаўлены.

У 1907 г. быў надрукаваны лацінкай і кірыліцай "Русінскі лемантар", аўтарам якога з'яўляўся невядомы выхадзец з Беларускага Палесся.

Ёсць сведчанні, што прыкладна ў 1911 г. над беларускім букваром шмат працаваў М. Багдановіч. Рукапіс з каляровымі малюнкамі быў падрыхтаваны, аднак пра яго далейшы лёс нічога невядома.

У паслярэвалюцыйны час існавала мноства беларускіх букварoў для дзяцей і дарослых:

- Наша сіла — ніва ды машына. Лемантар для дарослых (М. Байкоў, С. Некрашэвіч, 1925 г.);
- Наша сіла — Саюз. Лемантар для сельскагаспадарчых і лясных рабочых (1926 г.);
- Лемантар для дарослых (Ю. Пушкевіч, 1926 г.) і інш.

У 20-я гг. XX ст. дапускалася існаванне букварoў, складзеных на альтэрнатыўнай метадычнай аснове. Настаўнік меў права выбару букварoў у залежнасці ад таго, якой методыкай ён лепш валодаў.

К. Міцкевіч, вядомы і як метадыст, у "Методыцы роднае мовы" асаблівую ўвагу надаваў наступным выданням паслярэвалюцыйнага перыяду:

- Зорка. Першая навука чытання і пісання для беларускіх дзетак (А. Смоліч, 1922 г.);
- Беларускі лемантар (С. Некрашэвіч, 1922 г.);
- Чырвоная змена. Лемантар (А. Федасенка, 1925 г.) [2].

А. Смоліч пры распрацоўцы лемантара кіравалася прынцыпамі У. Флёрава. Сярод станоўчых бакоў адзначанага буквара вылучаюць наступныя:

- мэтазгоднасць размеркавання матэрыялу;
- удалы падбор малюнкаў;
- наяўнасць матэрыялу для развіцця вуснага маўлення вучняў і падагульнення ўсяго пройдзенага па лемантары;
- разразная азбука і слоўнік для некаторых слоў;

- рэалізацыя прынцыпу паступовага нарастання цяжкасцей пры навучанні чытанню слоў;
- спецыяльны матэрыял для пісьма.

Беларускі лемантар С. Некрашэвіча грунтаваўся на гукавым метадзе навучання грамаце. Спачатку ў лемантары прапаноўваліся сюжэтныя малюнкі, якія прадугледжвалі працу па развіцці маўлення вучняў. На наступным этапе адбывалася знаёмства з гукамі і літарамі на аснове адна- і двухскладовых слоў. Затым паступова падключаліся і трохскладовыя словы. Лексічны матэрыял адабраны з улікам узроставых асаблівасцей малодшых школьнікаў. Парадак знаёмства з гукамі і літарамі быў абумоўлены паступовым нарастаннем цяжкасцей для дзяцей у чытанні і пісьме.

У другой частцы лемантара — "Сярод дзетак і жывёлін" — прапаноўваўся матэрыял для далейшага ўдасканалення навыку чытання. У канцы даваўся ўзор усіх малых і вялікіх рукапісных літар, лічбаў, "беларускі альфабэт", разразная азбука. Шмат увагі надавалася заданням для пісьма: спачатку прапаноўваліся практыкаванні для падрыхтоўкі рукі дзіцяці да пісьма (графічныя заданні, матэрыял для малявання, мадэлі для лепкі), крыху пазней даваліся ўзоры напісання слоў і сказаў.

У якасці зыходнай пазіцыі для распрацоўкі буквара А. Федасенкі "Чырвоная змена" быў выбраны метад цэлых слоў. Навучанне чытанню і пісьму па гэтым дапаможніку адбывалася сумесна. Лемантар забяспечваў фарміраванне элементарных прыродазнаўчых уяўленняў, знаёмства з сацыяльна-палітычным жыццём, гісторыяй, геаграфіяй. Як і ў буквары С. Некрашэвіча, спачатку прапаноўваліся малюнкі для развіцця вуснага маўлення, графічныя практыкаванні падрыхтоўчага характару, узоры аплікацый, арнаментаў, малюнкі прадметаў для лепкі. Навучанне грамаце грунтавалася на запамінанні вучнямі адразу цэлых слоў у рукапісным і друкаваным варыянтах без іх складовага і гука-літарнага аналізу. Спачатку дзеці чыталі словы, адгадваючы іх па адпаведных малюнках і абрысах літар, затым са слоў вылучалі гукі і літары. Паступова матэрыял ускладняўся. Многія тэксты суправаджаліся дадатковымі заданнямі творчага характару. Да буквара былі распрацаваны метадычныя парады для настаўніка.

Заслугоўвае ўвагі славуты беларускі буквар С. Паўловіча "Першыя зярняткі" (1936 г.), які прызначаўся для хатняга навучання беларускай мове. Буквар распрацоўваўся на аснове метаду цэлых слоў. Варта адзначыць багаты ілюстрацыйны матэрыял — у мастацкім афармленні буквара прымаў удзел Язэп Драздовіч. У 1937 г. выйшла чытанка С. Паўловіча "Засеўкі".

З 1929 г. навучанне грамаце ажыццяўлялася толькі на аснове гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду. З гэтага часу і да 1969 г. у школах выкарыстоўваўся буквар Н. Сіўко (1929—1932 гг. — у сааўтарстве з Л. Лукіной; 1937 г. — у сааўтарстве з З. Ліхачовай). У гады Вялікай Айчыннай вайны ў партызанскіх "зялёных" школах дзяцей вучылі па самаробных букварах, у тым ліку па вядомым буквары А. Ліпскай.

У 1969 г. выйшла першае выданне буквара за аўтарствам дзіцячага пісьменніка А. Клышкі. Гэты дапаможнік быў распрацаваны на аснове гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду з улікам апошніх дасягненняў у галіне лінгвістыкі, дзіцячай псіхалогіі, педагогікі. Ён шмат разоў дапрацоўваўся і перавыдаваўся. У 1977 г. буквар А. Клышкі атрымаў залаты медаль на Міжнароднай выставе ў Лейпцыгу за мастацкае афармленне кнігі. У 90-я гг. ХХ ст. выдадзены новы буквар, распрацаваны па арыгінальным метадзе, у адпаведнасці з якім вывучэнне ўсёй сістэмы зычных гукаў і літар для іх абазначэння на пісьме папярэднічала вывучэнню галосных гукаў.

Для падрыхтоўчых класаў у 1983 г. выйшаў эксперыментальны дапаможнік "АБВ" А. Шанько. Навучанне чытанню па гэтым дапаможніку адбывалася з улікам традыцыйных прынцыпаў. Разам з тым у "АБВ" уводзіліся графічныя мадэлі слоў, стужкі літар для паўтарэння і абагульнення вывучанага. Згаданы буквар быў цікавы па змесце і афармленні.

У 1992 г. быў выдадзены "Букварь" на рускай мове Н. Старажавай і Т. Шанько; у 2008 г. — "Букварь" Н. Старажавай. У 1998 г. А. Клышка таксама падрыхтаваў "Букварь" на рускай мове.

Сёння навучанне грамаце ў школах з беларускай мовай навучання і выхавання ажыццяўляецца па буквары А. Клышкі (2017 г.). У падрыхтоўчы перыяд навучання грамаце ў ім прадугледжана знаёмства з асноўнымі лінгвістычнымі паняццямі: маўленне — сказ — слова — гук.

Асноўны перыяд навучання грамаце пачынаецца з вывучэння дзесяці літар для абазначэння зычных гукаў: *с, п, м, т, л, н, ш, р, к, д*. На кожнай старонцы, прысвечанай новай літары, прапануюцца яе друкаваны і рукапісны варыянты; для запамінання абрысаў літар у буквары змеш-

чаны вершаваныя двухрадкоўі, якія на ўроку чытае настаўнік. Паслядоўнасць увядзення літар у буквары абумоўлена прынцыпам частотнасці. Знаёмства са складам і націскам прадугледжана перад вывучэннем літар для абазначэння галосных гукаў *(а, я, у, і)*.

Асноўны прыём навучання чытанню прамых складоў, які рэалізуецца ў буквары, — чытанне "па падабенстве" (па аналогіі). У буквары пры знаёмстве з новымі гукамі адпрацоўваецца чытанне складоў, слоў, сказаў і тэкстаў. Буквар насычаны займальнымі і гульнёвымі заданнямі. У заключны перыяд навучання грамаце для чытання прапануюцца разнастайныя па змесце і невялікія па аб'ёме мастацкія тэксты (вершы, апавяданні, загадкі і інш.).

Варта звярнуць увагу на нацыянальна-культурны кампанент буквара А. Клышкі. Асобныя старонкі прысвечаны асветнікам Беларусі (Францыск Скарына, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі), знаёмству з класікамі беларускай літаратуры (Янка Купала, Якуб Колас) і іх вершаванымі творамі. Падаецца ў буквары і інфармацыя пра старажытныя гарады Беларусі — Полацк, Навагрудак, Мір; сталіцу Рэспублікі Беларусь — горад Мінск. Вучні знаёмяцца са святамі беларускага народа; з гісторыяй стварэння кнігі і інш. Такім чынам, разнастайны матэрыял, змешчаны на старонках буквара, садзейнічае выхаванню ў першакласнікаў цікавасці да роднага краю, яго гісторыі, культуры і традыцый беларускага народа.

Трэба адзначыць, што аўтарамі буквароў станавіліся практыкі, якія мелі багаты ўласны досвед у пытаннях навучання грамаце. Спецыяльных даследаванняў у галіне букварыстыкі на Беларусі не праводзілася.

У 2017 г. быў выдадзены новы буквар на рускай мове для школ з рускай мовай навучання і выхавання, аўтар якога вядомы вучоны, кандыдат педагагічных навук, дацэнт В. І. Цірынава. Пры распрацоўцы гэтага буквара ўлічваліся апошнія навуковыя даследаванні па лінгвістыцы, псіхалінгвістыцы, псіхалогіі, дыдактыцы, лепшыя традыцыі класічнай методыкі навучання грамаце. У яго ўключаны арыгінальны матэрыял, які рэалізуе ідэі развіццёвага навучання [3], прадстаўлена новая сістэма апорных схем, арыенціраў, алгарытмаў для засваення спосабаў дзеянняў. Вывучэнне новага матэрыялу, як правіла, арганізуецца праз выкарыстанне праблемных пытанняў і заданняў, што дазваляе вучням самастойна рабіць адкрыццё на ўроку. На старонках буквара сустракаюцца спецыяльныя схемы з малюнкамі, якія дазваляюць абагульніць, паўтарыць і зафіксаваць у памяці засвоены на ўроку матэрыял.

Аўтар прапануе новую паслядоўнасць вывучэння літар: спачатку вучні знаёмяцца з шасцю літарамі, якія абазначаюць галосныя гукі *(а, у, и, о, э, ы)*. Вызначаная ў буквары паслядоўнасць увядзення літар "дае магчымасць максімальна хутка пачынаць чытаць словы, сказы і невялікія тэксты" [3, с. 56]. Першае слова з двух складоў для чытання — *мама*. У буквары ўведзены новыя прыёмы навучання чытанню прамых складоў: "чытанне па дарожках" з чарапахай і ракетай; чытанне складоў з апорай на прадметны малюнак і інш. Аўтар уключыла багаты разнастайны матэрыял для адпрацоўкі навыку чытання тэкстаў. У буквары рацыянальна выкарыстаны форзацы: прапануюцца табліцы-трэнажоры для адпрацоўкі навыку хуткага чытання складоў і слоў.

Аўтарам прыдуманы і падабраны разнастайныя тэксты на тэмы патрыятычнага, духоўнага, працоўнага выхавання. Варта адзначыць, што ў новым буквары прадугледжаны заданні для арганізацыі працы па пазакласным чытанні, якія звязаны з тэмай навучання грамаце.

Такі шлях беларускага буквара ад Скарынавых часоў да нашых дзён. Праблемы навучання грамаце паступова набывалі навуковае асэнсаванне: распрацоўваюцца новыя тэарэтыка-металагічныя асновы (кампетэнтнасны, культуралагічны, асобасна-арыентаваны падыходы), тэхналагічныя мадэлі, адпаведнае навукова-метадычнае забеспячэнне.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Беларуская мова : энцыкл. — Мінск : БелЭн, 1994. — 654 с.
2. Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. Т. 15 : П'есы. Метадычныя распрацоўкі / Я. Колас ; рэд. Т. С. Голуб. — Мінск : Беларус. навука, 2011. — 792 с.
3. Тиринова, О. И. Новые учебные пособия по обучению грамоте для I класса / О. И. Тиринова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2017. — № 8. — С. 53—59.